 Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-01-18

# Юбілей патрыярха

«Чалавек — сукупнасць свайго мінулага» — такую назву для выстаўкі, падрыхтаванай супрацоўнікамі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, прапанаваў сам яе герой — навуковец і пісьменнік Уладзімір Гніламёдаў.



*Уладзімір Гніламёдаў і Мікалай Чаргінец.*

**Кіра МУРАЎСКАЯ, фота з сайта www.csl.bas-net.by**

Госці вечарыны акрамя знаёмства з экспанатамі — раманамі, манаграфіямі, кнігамі крытыкі — змаглі павіншаваць Уладзіміра Васільевіча з 75-годдзем, пабачыць невялікі фільм, прысвечаны асобе літаратуразнаўца, і набыць новыя выданні: кнігу пра юбіляра «Заставацца сабой...» («Чатыры чвэрці», 2012) і даследаванне самога У. Гніламёдава «Янка Купала. Жыццё і творчасць». Дарэчы, дырэктар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна Анцух падкрэсліла, што не рабіла «кнігу да юбілею»: «Я ганаруся, што мы спрычыніліся да гэтай справы. Увесь год людзі чыталі і разумелі, з кім мы жывём побач, хто наш сучаснік!»

Сябры, калегі, вучні выказвалі шчырае захапленне шматграннай дзейнасцю гэтага чалавека. «Я здзіўляюся, як ён вытрымлівае цяжар тых добрых спраў, якія робіць», — прызнаўся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец. Уладзімір Васільевіч атрымаў вышэйшую ўзнагароду творчага саюза — медаль «За вялікі ўклад у літаратуру», а таксама ордэн «Вернасць і вера» ад Міжнароднага руху «Сям'я — Адзінства — Айчына».

І творцы, і крытыкі называлі мастацкія творы У. Гніламёдава «вяршыняй нацыянальнай літаратуры». Да слова, новы раман «Ліхалецце» публікуецца на старонках часопіса «Полымя», галоўны рэдактар якога Мікола Мятліцкі выказаўся так: «Дзякуй, што не даяце «Полымю» пагаснуць!» Даследчык Мікола Мікуліч падкрэсліў, што для аналізу і спасціжэння створанага пісьменнікам варта разглядаць яго побач з найлепшымі айчыннымі літаратарамі.

Сваю ўдзячнасць калегу-акадэміку выказалі прадстаўнікі ВАКа ды акадэмічных інстытутаў, а таксама Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, якія ўручылі падарункі і граматы ад сваіх устаноў.

Як толькі не называлі юбіляра падчас імпрэзы — Волатам, Віцязем, Патрыярхам беларускай філалогіі, Класікам айчыннай літаратуры... Сам Уладзімір Гніламёдаў падсумаваў сустрэчу, адзначыўшы, што для яго важна было пачуць добрыя словы, яшчэ раз пабачыць сяброў і калег, хаця і прызнаўся раптам: «Мне ніколі не сумна аднаму...» Можа, таму, што так шмат яшчэ трэба сказаць на старонках новых раманаў і манаграфій, таго, што не скажа ніхто, акрамя яго...